УДК 811.161.3

**Т. М. Аліферчык** (Мінск)

# КАНЦЭПТЫ БЕЛАРУСКАЙ АНАМАСТЫЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ І ІХ УЗАЕМАДЗЕЯННЕ[1]

У сучаснай сусветнай і ўсходнеславянскай лінгвістыцы актыўна развіваецца новы кірунак тэрміналагічных даследаванняў – у кантэксце антрапалагічнай парадыгмы гуманітарыстыкі. Апошнія дзесяцігоддзі шырока рэалізаваны лінгвакагнітыўны падыход у тэрміназнаўстве [1; 2; 3; 4]. Відавочна, лінгвакагнітыўны падыход, у адрозненне ад традыцыйнага, ускладняе і паглыбляе разуменне тэрміна. Калі пры ўласна лінгвістычным кантэксце прадмет даследавання – менавіта лінгвістычныя характарыстыкі тэрміна, яго сінтагматычныя і парадыгматычныя сувязі, то кагнітыўнае тэрміназнаўства даследуе суаднясенне канцэптуальных і моўных структур у прафесійнай сферы, асаблівасці канцэптуалізацыі прафесійна значных аб'ектаў. Пад уплывам кагнітыўнай лінгвістыкі мэты тэрміназнаўчых даследаванняў змясціліся з вывучэння спецыфічных якасцяў тэрміна на яго ўнутраную прыроду, абумоўленую сувяззю з прафесійнай камунікацыяй, прафесійным пазнаннем і прафесійнай дзейнасцю, на праблему прадстаўлення ведаў у тэрміне [6, с. 196–197]. Такім чынам, тэрміналогія ў кагнітыўным кантэксце разглядаецца як вынік кагнітыўнай дзейнасці спецыяліста, што заключаецца ў канцэптуалізацыі і вербалізацыі прафесійных ведаў.

Сучасныя даследаванні тэрміналогіі адлюстроўваюць ідэю аб канцэптуальнай структуры тэрміна, паколькі мадэляванне канцэптаў будуецца на аналізе семантыкі моўных сродкаў, якія фарміруюць гэты канцэпт [8]. "*Навуковы канцэпт* можна вызначыць як максімальна кагнітыўна сканцэнтраванае ўтварэнне, як генеральную сукупнасць розных тэрміналагічных інфармацыйных сістэм, якія ўяўляюць стратыфікацыйнае дзяленне навуковай сферы ведаў, якія рэалізуюць у працэсе навуковай камунікацыі шэраг асноўных функцый, такіх, як кагнітыўна-гнасеалагічная, камунікатыўна-прагматычная, дэрывацыйна-метамоўная і інш." [5].

Даследаванне анамастычнай тэрміналогіі ў кагнітыўным аспекце вызначаецца асаблівай складанасцю, паколькі сама сфера прафесійных ведаў – анамастыка – адрозніваецца своеасаблівай спецыфікай. У кантэксце традыцыйна лінгвістычнага падыходу аб'ектам даследавання анамастыкі з'яўляюцца ўсе групы ўласных імёнаў і назваў – онімы, а таксама іх семантыка, фарміраванне, функцыянаванне і інш. У кантэксце лінгвакагнітыўнага падыходу да аналізу анамастычнага матэрыялу аб'ектам можна лічыць кагнітыўныя механізмы/кагніцыі, якія сталі падставай фарміравання, станаўлення і развіцця онімаў. Такім чынам, кагнітыўная анамастыка – навуковы напрамак, які даследуе спосабы ўвасаблення, захоўвання і перадачы інфармацыі/ведаў ва ўласных імёнах [7, с. 42]. Як адзначае В. В. Рабустава, "кагнітыўная анамастыка ставіць перад сабой наступныя задачы: выявіць і вывучыць мадэлі пабудовы онімаў, спецыфіку замацавання ў іх інфармацыі, яе канкрэтызацыю, асаблівасці ўвасаблення інфармацыі (значэння) ва ўласным імені, перавагу выкарыстання анамастычнай лексікі перад іншымі формамі актуалізацыі інфармацыі (значэнняў)" [Там жа].

---

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах праекта БРФФД Г19М-122 "Беларуская анамастычная тэрміналогія: структурны і лінгвакагнітыўны аспекты".

Аднак мэтазгодна падкрэсліць, што *анамастычны канцэпт* адрозніваецца ад *канцэпту анамастычнай тэрміналогіі*. Калі анамастычны канцэпт – гэта сукупнасць ведаў аб аб'екце, якія ўвасоблены ў яго імені, то канцэпт анамастычнай тэрміналогіі – сукупнасць прафесійных анамастычных ведаў аб шэрагу падобных аб'ектаў, напр., канцэпт анамастычнай тэрміналогіі "чалавек" можа ўключаць не столькі сукупнасць ведаў аб чалавеку, якія адлюстраваны ў яго імені/мянушцы/прозвішчы, а ў большай ступені сукупнасць прафесійных ведаў у цэлым аб імёнах/мянушках/прозвішчах, у тым ліку асаблівасці матывацыі антрапонімаў, антрапанімічныя мадэлі, спецыфічныя антрапафарманты, этымалогію антрапонімаў, сферы функцыянавання антрапонімаў і г.д. Канцэпт анамастычнай тэрміналогіі "месца" ёсць сукупнасць прафесійных ведаў аб уласных назвах асобнага раду ландшафтных аб'ектаў, матывацыі назваў, асновах як рэсурсу тапанамінацыі, тапонімаўтваральных фармантах, сферах і асаблівасцях функцыянавання і іншых аспектах.

Такім чынам, канцэпты анамастычнай тэрміналогіі акумулююць інфармацыю аб пазнанні іншага ўзроўню – узроўню прафесійных ведаў адпаведнай вобласці.

Асноўнымі (базавымі) канцэптамі анамастычнай тэрміналогіі як адлюстравання анамастычных ведаў, на нашу думку, з'яўляюцца наступныя: "імя/уласная назва", "чалавек", "месца", "вынікі антрапалагічнага ўздзеяння". Узаемадзеянне адзначаных канцэптаў анамастычнай тэрміналогіі можна ўявіць у адпаведнай схеме:




На прапанаванай схеме невыпадкова адзначана ўзаемадзеянне выдзеленых канцэптаў. Анамастычная сфера, як неаднаразова адзначана рознымі даследчыкамі, – даволі спецыфічная вобласць. У анамастычных адзінках адлюстраваны вопыт пазнання чалавекам навакольнага асяроддзя і сябе ў ім, а таксама вопыт уплыву на навакольнае асяроддзе. Адпаведна, адзначаны вопыт увасоблены ва ўласных назвах, так ці інакш стасуемых з кагнітыўнымі паводзінамі. Такім чынам, канцэпты "чалавек", "месца", "вынікі антрапалагічнага ўздзеяння" характэрны ў цэлым для анамастычнай сферы і для вобласці анамастычнай тэрміналогіі як сістэмы адлюстравання прафесійных ведаў. Пры гэтым адзначаныя канцэпты ўзаемадзейнічаюць не толькі паміж сабой, але і з канцэптам "імя/уласная назва" як аднаго з асноўных, паколькі рэалізацыя першых трох канцэптаў магчыма толькі праз канцэпт "імя/уласная назва", што і з'яўляецца спецыфікай анамастычных ведаў у цэлым. На нашу думку, канцэпт "імя/уласная назва" так ці інакш ёсць адлюстраванне існуючых тэорый семантыкі імя ўласнага.

Намі прапанавана наступная структура навуковага канцэпту на падставе аналізу канцэптаў анамастычнай тэрміналогіі:

*Канцэпт → (катэгорыя) → паняцце → тэрмін.*

Канцэпты анамастычнай тэрміналогіі рэалізаваны праз катэгорыі, якія, у сваю чаргу, эксплікаваны ў адпаведных паняццях, якія маюць адпаведны(я) тэрмін(ы).

Канцэпты "чалавек", "месца" і "вынікі антрапалагічнага ўздзеяння" адлюстраваны ў катэгорыях анамастычнай тэрміналогіі, якія на ўзроўні мовы/тэрміналогіі падзелены на асобныя групы і падгрупы паняццяў і адпаведных тэрмінаў: антрапаніміка, тапаніміка, эрганіміка/хрэматаніміка.

Канцэпт "месца" рэалізуецца праз некалькі катэгорый, напр., *элемент натуральнага ландшафту* і *заселенае месца*. Для кожнай катэгорыі існуе сістэма паняццяў, якія вербалізаваны праз адпаведныя тэрміны. Катэгорыя *элемент натуральнага ландшафту* эксплікавана праз паняцці, напр., *гара, лес, водны аб'ект* (*возера* і *рака*), *балота* і інш., якія вербалізаваны праз тэрміны *аронім, дрымонім, гідронім* (*лімнонім* і *патамонім* адпаведна), *гелонім*. Для катэгорыі "*заселенае месца*" адным з паняццяў з'яўляецца *пасяленне* (для якога адпавядае тэрмін *айконім*), якое ў сваю чаргу дзеліцца на залежныя паняцці *гарадское* (*астыёнім*) і *сельскае* (*камонім*) *пасяленне*.

Яскравым прыкладам узаемадзеяння канцэптаў "месца" і "вынікі антрапалагічнага ўздзеяння" можа быць катэгорыя *элемент ландшафту як вынік дзейнасці чалавека*, прадстаўленая, напр., праз паняцце *элемент ландшафту, апрацаваны, але не заселены* (якое вербалізавана праз тэрміны *мікратапонім/анайконім*). Да гэтай ж катэгорыі адносяцца і ўсе элементы інфраструктуры паміж населенымі пунктамі і іншымі аб'ектамі – *гадонімы*. Відавочна, вербалізацыяй катэгорыі *штучны элемент ландшафту як вынік дзейнасці чалавека* можна лічыць паняцце *прадпрыемствы па-за межамі населеных пунктаў* з адпаведным тэрмінам *эргатапонім*.

Неабходна адзначыць, што ў некаторых выпадках канцэпт можа быць рэалізаваны праз сістэму паняццяў і далей тэрмінаў, мінуючы сістэму катэгорый. Ілюстрацыяй у гэтым выпадку можа быць канцэпт "чалавек".

Канцэпт "чалавек" эксплікаваны праз паняцці *афіцыйнае* і *неафіцыйнае імя*. Паняцце *афіцыйнае імя* фактычна разумеецца як *іменная формула* – у сучасны перыяд гэта імя, імя па бацьку і прозвішча. Неабходна ўдакладніць, што такі від іменнай формулы характэрны для сучаснага этапу антрапанімікі, які істотна адрозніваецца ад іншых папярэдніх традыцый фарміравання іменнай формулы/іменавання чалавека. Паняцце *неафіцыйнае імя* эксплікавана праз паняцці іншага ўроўню, напр., *імя-характарыстыка* (з адпаведным тэрмінам *мянушка*) і *свядома выбранае несапраўднае імя* (з адпаведным тэрмінам *псеўданім* (і *інтэрнет-онім* (*нік, нікнейм* і інш.) як адзін з відаў псеўданіма). Паняцце *імя-характарыстыка* дзеліцца на групы – па бацьку (з адпаведным тэрмінам *патронім*), па маці (*матронім*), жанчыны па мужу (*андронім*) і іншыя групы мянушак рознай матывацыі (напр., паводле фізічных якасцяў, разумовых якасцяў, умоўна законным/незаконным паходжаннем і іншых аспектаў).

Узаемадзеянне канцэптаў "месца" і "чалавек" рэалізавана, напр., на ўзроўні паняцця *прозвішча/мянушка паводле месца пражывання альбо нараджэння*, што вербалізавана ў тэрміне *адтапанімічнае прозвішча/мянушка* (напр., *Пінчук, Дастаеўскі* і інш.).

Канцэпт "вынікі антрапалагічнага ўздзеяння" можа быць рэалізаваны праз наступныя катэгорыі: *вытворчая/эканамічная дзейнасць*, *матэрыяльная культура* і *нематэрыяльная культура*.

Катэгорыя *вытворчая/эканамічная дзейнасць* адлюстравана ў паняццях *аб'яднанні людзей* (напр., прадпрыемствы, прафесійныя калектывы, што верба-

лізавана ў тэрміне *эргонімы*), *інфраструктура* (з адпаведным тэрмінам *драмонімы*), *прадукты дзейнасці* (для якога адпавядае тэрмін *прагматонім*) і інш. Відавочна, да гэтай жа катэгорыі адносіцца і паняцце *маркетынгавая*.

Катэгорыя *матэрыяльная культура* (для якой адпавядае тэрмін *хрэматонім*) уключае розныя паняцці, напр., найменні аб'ектаў культуры (*артыёнімы* 'найменне мастацкіх твораў рознага жанру, у тым ліку карцін, статуй, фільмаў і інш.'), *парэйонім* 'уласная назва канкрэтнага траспартнага сродку') і інш.

Катэгорыя *нематэрыяльная культура* (з адпаведным тэрмінам *ідэонім*) адлюстравана ў паняццях *літаратурная творчасць* (літаратурная анамастыка), *рэлігія*, *міфалогія* і інш. – усё тое, што ўмоўна не адлюстравана ў прадметнай вобласці.

Відавочна, у артыкуле рэалізацыя вызначаных канцэптаў і іх узаемадзеянне абазначана схематычна.

Неабходна адзначыць, што спецыфіка канцэптуалізацыі анамастычных тэрмінаў звязана ў першую чаргу са спецыфікай анамастычных ведаў у цэлым, якая заключаецца ў адлюстраванні ў імені лінгвістычных і экстралінгвістычных ведаў аб чалавеку або прасторавым аб'екце.

Можна меркаваць, што канцэптуалізацыя аспектаў антрапалагічнага ўздзеяння на арганізацыю прасторавых адносінаў з'яўляецца пазнейшай у адносінах да канцэптуалізацыі ведаў пра чалавека і прастору праз імя.

У другую чаргу, спецыфіка канцэптуалізацыі анамастычных тэрмінаў звязана з менавіта прафесійным узроўнем анамастычных ведаў, якія адрозніваецца высокай ступенню арганізаванасці і структураванасці і якія пазбаўлены наіўна-паўсядзённага разумення. Акрамя гэтага неабходна адзначыць амаль поўную адсутнасць эмацыйнага кампанента ў складзе канцэптаў анамастычнай тэрміналогіі (у адрозненне ад анамастычных канцэптаў у цэлым), што вынікае з неабходнасці адлюстравання ў тэрмінах менавіта прафесійнага ўзроўню ведаў.

ЛІТАРАТУРА


1. *Голованова, Е. И.* Введение в когнитивное терминоведение / Е. И. Голованова. – М. : Флинта : Наука, 2011. – 224 с.

2. *Грунина, Л. П.* Когнитивный аспект исследования терминов / Л. П. Грунина, А. Г. Широколобова // Филологические науки. Вопросы теории и практики. – 2010. – № 1 (5): в 2 ч. – Ч. I. – С. 97–99.

3. *Іващенко, В. Л.* Когнітивне термінознавство: перспективи розвитку / В. Л. Іващенко // Термінологічний вісник. – 2011. – Вип. 1. – С. 47–54.

4. *Кізіль, М. А.* Когнітивне термінознавство: витоки, завдання й перспективи розвитку / М. А. Кізіль // Науковий вісник Міжнар. гуманіт. ун-ту. Сер.: Філологія. – 2015. – № 16. – С. 182–185.

5. *Макаренко, Е. Д.* Концепт как знак языка науки / Е. Д. Макаренко // Филологические науки. Вопросы теории и практики. – 2015. – № 3 (45): в 3 ч. – Ч. I. – С. 143–145.

6. *Ревина, Ю. Н.* Когнитивные исследования в области терминоведения [Электронный ресурс] / Ю. Н. Ревина. – Режим доступа: http://elar.urfu.ru/bitstream/10995/25318/1/avfn_2013_38.pdf. – Дата доступа: 29.05.2020.

7. *Робустова, В. В.* К когнитивной ономастике / В. В. Робустова // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 19: Лингвистика и межкультурная коммуникация. – 2014. – № 1. – С. 41–49.

8. *Росянова, Т. С.* Когнитивный подход к рассмотрению термина / [Электронный ресурс]. / Т. С. Росянова. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/kognitivnyy-podhod-k-rassmotreniyu-termina. – Дата доступа: 28.05.2020.